ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

15 кастрычніка 1931 г.
№ 240 (1509)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Мы бярэм крэпасьць за крэпасьцю

„...Датэрмінова выканаць пляны асеньніх гаспадарча-палітычных кампаній. Па-бальшавіцку ўзяцца за вырашэньне задачы атрыманьня высокіх ураджаяў на аснове ўжываньня ўсіх заваёў агранамічнай навукі" (Якаўлеў)

Да ўсіх рабочых, работніц, колгасьнікаў, колгасьніц, беднякоў і серадняков

(З адозвы ЦК КП(б)Б)

Таварышы!

Рабочая кляса Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК дабілася бліскучых посьпехаў ва ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва.

Па БССР колектывізавана каля 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, організавана 329 саўгасаў з пасеўнай плошчай у 610 гект., створана 30 МТС, працуе на палёх 1.740 трактароў, пасеяна



Узьмёту зябі—ударныя тэмпы

і ўбрана 240.000 гект. ільну і канапель.

Наша краіна падышла да рашаючага этапу соцыялістычнага будаўніцтва—да завяршэньня пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі СССР. Колгаснае сялянства стала асноўным вытворцай с.-г. продукцыі і сапраўды моцнай апорай партыі і савецкай улады на вёсцы.

„Дзень колектывізацыі і ўраджаю" зьяўляецца днём масавага агляду посьпехаў і дасягненьняў соцыялістычнага земляробства, днём масавай праверкі выкананьня заданьняў партыі і ўраду аб соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Гэты дзень павінен зьявіцца магутным фактарам павышэньня вытворчай актыўнасьці ўсіх працоўных мас на яшчэ больш шпаркае разьвіцьцё соцыялістычнай экономікі СССР, на падцягваньне тых вучасткаў прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, якія адстаюць.

Перад вамі стаіць задача ўзмацняць свой пролетарскі ўплыў у соцыялістычнай перабудове вёскі. Перадавайце вопыт бальшавіцкіх тэмпаў і соцыялістычных мэтадаў працы перадавых фабрык і заводаў у падшэфныя колгасы і вёскі.

„Дзень ураджаю і колектывізацыі" павінен прайсьці пад знакам узмоцненай барацьбы за выкананьне промфінпляну, асабліва за поўную рэалізацыю програм вырабу с.-г. машын.

Шпаркі рост, гіганцкія посьпехі колгаснага будаўніцтва патрабуюць наўхільнага ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб організацыйна-гаспадарчым змацаваньні колгасаў.

Умацаваць колгасы—гэта значыць правільна організаваць працу, укараніць зьдзельшчыну ва ўсіх відах работы, наладзіць яе дакладны ўлік, ліквідаваць абязьлічку, вытравіць з колгаснай практыкі дробна-буржуазную ўраўнілаўку.

Барацьба за аўладаньне агратэхнікай, за павышэньне ўраджайнасьці, за якасьць работы, за шырокае разгортваньне падрыхтоўкі кадраў соцыялістычнага земляробства зьяўляецца баявой задачай для ўсёй грамадзкасьці.

Організацыйна-гаспадарчае змацаваньне колгасаў на даным этапе колгаснага будаўніцтва зьяўляецца галоўнай рашаючай задачай, практычнае вырашэньне якой вызначае сабою новыя посьпехі ў соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

Разьмеркаваньне даходаў па працаднёх—асноўнае зьвяно організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў, за якое зараз трэба ўхапіцца.

Толькі на аснове разьмеркаваньня даходаў па колькасьці і якасьці працы замацоўваецца зьдзельшчына, узьнімаецца продукцыйнасьць працы, павышаюцца якасныя паказальнікі колгаснай вытворчасьці.

Разьмеркаваньне даходаў адбываецца ў абставінах жорсткага клясавага змаганьня. Кулацтва, зьмяніўшы сваю тактыку, бярэ курс на разбурэньне колгасаў з сярэдзіны, вядзе ўзмоцненую агітацыю за разьмеркаваньне ўраджаю па ядоцка-падушным прынцыпе. Гэтым самым кулацтва імкнецца сарваць організацыйна-гаспадарчае змацаваньне колгасаў. Усякія праяўленьні ўраўнілаўкі, адкрытай або захаванай, ЦК разглядае, як праяўленьні кулацкага ўплыву. ЦК заклікае ўсю партыйную організацыю, усіх колгасьнікаў весьці самае бязьлітаснае змаганьне супроць ураўнілаўкі, у якім-бы выглядзе яна не зьяўлялася. Разьмеркаваньне ўраджаю павінна быць узята пад суровы грамадзкі кантроль, павінна праводзіцца пры ўмовах няўхільнага захаваньня прынцыпу: „хто больш працуе, той больш і атрымлівае".

„Дзень колектывізацыі і ўраджаю" павінен зьявіцца магутным фактарам у справе ліквідацыі прарываў на фронце разгортваньня соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Неабходна ўзмацніць увагу ўсіх партыйных, савецкіх і грамадзкіх організацый да вырашэньня задач жывёлагадоўлі, асабліва сьвінагадоўлі, якая дае магчымасьць найбольш хутка вырашыць мясную проблему. Усямерная садзейнасьць пашырэньню стада, правядзеньне заотэхнічных мерапрыемстваў, падрыхтоўка да зімоўкі жывёлы (будаўніцтва абораў і сьвінарнікаў), пашырэньне кармовай базы—вось самыя адказныя і ўдарныя вучасткі работы, куды трэба накіраваць усе лепшыя сілы рабочых саўгасаў і колгасьнікаў. Паставіць жывёлу пад стрэхі, забясьпечыць яе кармамі і ў першую чаргу—сакавітымі вось задача сёньняшняга дня. Вызначаная партыяй і ўрадам праграма сіласаваньня—мільён тон сіласу—зьяўляецца мінімальнай. Ніякіх падстаў для яе скарачэньня няма. Мы можам і павінны дабіцца ня толькі выкананьня, але і перавыкананьня гэтай програмы. Ад першых посьпехаў на фронце разь-





віцьця жывёлагадоўлі да рашаючых перамог павінны ісьці шпаркімі тэмпамі саўгасы і колгасы.

Своечасовая уборка і загатоўка бульбы і гародніны, апрацоўка і датэрміновая здача ільну, выкананьне пляну загатоўкі збожжа, адгрузкі бульбы для Ленінграду—вакол гэтых кампаній трэба мобілізаваць усю колгасную і бядняцка-серадняцкую масу вёскі. У „Дзень колектывізацыі і ўраджаю" організуйце масавыя чырвоныя абозы ільну, збожжа, бульбы і інш. Ніводнага кілё збожжа, бульбы і гародніны прыватніку.



Абновім ураджай новай зямлі

Раньняе зябліва—гэта барацьба за высокі ўраджай. Выразная ўнутрыбрыгадная організацыя працы у саўгасах, МТС і колгасах, правільная расстаноўка сіл і ўмелае скарыстаньне сродкаў вытворчасьці ўзьнімаюць тэмпы сяўбы і зябліва. МТС, саўгасы і колгасы—на перадавыя позыцыі сяўбы і зябліва!

Таварышы! Мы атрымалі буйныя перамогі, якія маюць сусьветнае гістарычнае значэньне. Мы бярэм крэпасьць за крэпасьцю ў разьвіцьці соцыялістычнай экономікі. Наша краіна гіганцкімі крокамі рухаецца наперад па шляху соцыялізму.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б заклікае усіх рабочых, колгасьнікаў, бядняцка-серадняцкія масы аднаасобнікаў і ўсіх працоўныхператварыць „Дзень колектывізацыі і ўраджаю" у дзень масавага агляду посьпехаў соцыялістычнага земляробства у дзень мобілізацыі ўсіх сіл і сродкаў вытворчасьці на ліквідацыю прарываў, у дзень масавага паходу за падцягваньне тых вучасткаў прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, якія адстаюць.

Таварышы! „Дзень колектывізацыі і ўраджаю" мы праводзім напярэдадні 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі, напярэдадні найвялікшага сьвята ня толькі працоўных СССР, але і ўсяго сьвету. Найлепшым падарункам да 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі будзе поўнае выкананьне пляну соцыялістычнага будаўніцтва, выкананьне пляну загатовак на аснове шырокага разгортваньня соцспаборніцтва, поўнае і неадкладнае выкананьне дырэктыў партыі па організацыйна-гаспадарчым змацаваньні колгасаў.

Наперад за разгорнутае соцыялістычнае наступленьне па ўсім фронце!

За канчатковую перамогу соцыялізму!

ЦК КП(б)Б.

Раскажэце аб сваёй барацьбе

Дэкаднік „Дня ўраджаю і колектывізацыі", які праводзіцца з 14 па 25 кастрычніка, неабходна ператварыць у масавы агляд гаспадарчай дзейнасьці комсамолу па організацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню колгасаў. У гэты дэкаднік мы абмяняемся вопытам барацьбы за ўмацаваньне колгасаў, вопытам удзелу ў разьмеркаваньні прыбытку, вырашэньні програмы разьвіцьця соцыялістычнай жывёлагадоўлі, падрыхтоўкі жывёлы да зімы, організацыі працы ў колгасах, укараненьні зьдзельшчыны, соцспаборніцтва і ўдарніцтва, вопытам работы ўдарных комсамольскіх маладзёжных брыгад. У гэты дэкаднік узьнімаецца яшчэ больш актыўнасьць комсамольцаў і колгаснае моладзі на датэрміновае выкананьне пляну хлебазагатовак і здачы дзяржаве ільнавалакна.

Комсамольскія ячэйкі абавязаны дапамагчы праўленьням колгасаў організаваць выстаўкі дасягненьняў соцыялістычнага земляробства, наладзіць шырокую справаздачнасьць колгасаў перад аднаасобнікамі, разгарнуць работу па аўладаньню агротэхнікай.

Комсамольскія організацыі жывёлагадоўчых раёнаў у час дэкадніка павінны на старонках „Чырвонай Зьмены" расказаць, як яны змагаюцца за павялічэньне пагалоўя сьвіней, як будуюць сьвінарнікі, падводзяць кармовую базу і ўздымаюць продукцыйнасьць сьвінагадоўлі —барацьбу за тону-апарос.

Комсамольцы ільнаводных раёнаў павінны расказаць як яны змагаюцца за датэрміновае выкананьне пляну здачы дзяржаве ільнавалакна, удзел у будаўніцтве ільназаводаў.

За час „Дня ўраджаю і колектывізацыі" пакажам усе дасягненьні буйнага соцыялістычнага земляробства, забясьпечым датэрміновае выкананьне пляну гаспадарча-палітычных кампаній.

Організаваць масавы паказ дасягненьняў соцыялістычнага земляробства

Тэлеграма ўсім абкомам, крайкомам і ЦК КСМ нацыянальных рэспублік

ЦК прапануе забясьпечыць актыўны ўдзел усіх комсамольскіх організацый у „Дні ўраджаю і колектывізацыі", які праводзіцца з 14 па 25 кастрычніка.

Накіруйце асноўную ўвагу комсамолу на дальнейшае організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, правільнае разьмеркаваньне даходаў у іх, на практычнае вырашэньне задач разьвіцьця соцыялістычнай жывёлагадоўлі (выкананьне пляноў будаўніцтва, укомплектаваньне гурту, стварэньне кармовае базы), на праверку падрыхтаванасьці на мясцох да зімоўкі. Правільнай расстаноўкаю комсамольскіх і маладзёжных сіл, організацыя ўдарных маладзёжных брыгад, правядзеньнем зьдзельшчыны ў саўгасах і колгасах забясьпечце своечасовае выкананьне пляноў хлебзагатовак, асеньняга севу і зяблівага ворыва, даючы бязьлітасны адпор спробам клясавага ворага і яго агентуры апортуністым—затармазіць і сарваць выкананьне дырэктыў партыі і савецкае ўлады.

У гэты пэрыод організуйце па раёнах, буйных саўгасах, колгасах сельска-гаспадарчыя вытворчыя выстаўкі, масавы паказ дасягненьняў буйнага соцыялістычнага земляробства і яе перавагі над аднаасобным, уцягваючы аднаасобнікаў, беднякоў і серадзякоў у колгасы. Правядзеце конкурсы і прэміяваньне лепшых маладзёжных брыгад, удзельнікаў комсамольскіх МТС і паасобных перадавых ударнікаў з комсамольцаў і моладзі.

ЦК асабліва прапануе комсамольскім організацыям у „Дзень ураджаю і колектывізацыі" разгарнуць масавую работу сярод саўгасна-колгаснае моладзі і дарослых саўгасьнікаў і колгасьнікаў у галіне падняцьця ўраджайнасьці, аўладаньня тэхнікай і агротэхнікай сельскае гаспадаркі, разгортваньня агротэхнічнай пропаганды.

Організуйце ў колгасах і саўгасах кароткатэрміновыя курсы, брыгады завочнага навучаньня, спэцыяльныя брыгады маладых рацыяналізатараў і вынаходцаў, гурткі па вывучэньню складаных сельска-гаспадарчых машын (трактароў, комбайнаў).

Комсамольскім організацыям раёну тэхнічных культур, побач з адзначанымі мерапрыемствамі, трэба мобілізаваць свае сілы на пасьпяховае правядзеньне ўборкі і першапачатковую апрацоўку бавоўны, лёну, канапель, буракоў і бульбы.

Усяму комсамольскаму друку шырока асьвятляць правядзеньне „Дню ўраджаю і колектывізацыі" і ўдзел у ім комсамолу.

Сакратар УсеЛКСМ
К. Шарыпаў

ПА ТОЙ БОК МЯЖЫ

„...Не ўглыбляць Манжурскі інцыдэнт..."

ТОКІЁ, 11. Учора японскі ўрад адправіў Лізе Нацый адказ на апошнюю ноту, у якой Ліга напамінае Японіі аб даным ею абяцаньні не ўглыбляць манжурскі інцыдэнт. Тэкст адказу не апублікован.

Часовы ўрад

БЭРЛІН, 11. Харбінская кітайская газэта паведамляе: згодна прыказу Сюджан Сюэль організуецца новы часовы Гірынскі провінцыяльны ўрад.

Бамбандыроўка кітайскага лягеру

БЭРЛІН, 11. Японская газэта „Мандурыя - Бэйпін-Ньюс" паведамляе, што японскія аэропляны ў раёне Т. утварылі бамбандыроўку кітайскага лягеру у якім знаходзіцца 1400 салдат, кінута 40 бомб. Лік забітых вялікі

Павялічэньне выпадкаў „бандытызму"

МУКДЭН. Японскі друк паведамляе аб павялічэньні выпадкаў „бандытызму" у раёне Дупліо Захаўскай чыг. У Шанхайгуане настрой японскіх рэзыдэнтаў становіцца ўсе больш і больш чырвоным. Японскае консульства у Сяньбіне прапанавала ўсім японскім рэзыдэнтам гораду падрыхтавацца да эвакуацыі.

Галодныя дамонстрацыі ў Бэрліне

БЭРЛІН. У рабочым раёне Бэрліна—Вэдзінга і Шарлоценбурзе зноў адбыліся галодныя дэмонстрацыі беспрацоўных. Прычым, былі разгромлены некалькі булачных і калоніяльных крам. З крыкамі беспрацоўныя ўрываліся у продуктовыя магазыны і забіралі продукты харчаваньня. Паліцыі не ўдалося злавіць ніводнага беспрацоўнага. У Шарлоценбурзе у час дэмонстрацыі адбыліся сутычкі з паліцыяй. У Бернау ўчора пачалася забастоўка беспрацоўных, занятых на прымусовых грамадзкіх работах.

Беспрацоўныя кінулі работы і спынілі выплату кватэрнай платы. Забастоўка праходзіць пад лёзунгам вызваленьня ад прымусовых работ

Новы надзвычайны ўказ Брунінга нават формальна зьнішчае асноўныя грамадзкія правы, устаноўленыя ваймарскай конституцыяй



Справаздачна-перавыбарчая кампанія бюро ячэек навучальных устаноў

ЗАХЛІСНУТЫЯ ЖЫЦЦЕМ

прадзедаўскія мэтоды працы пануюць яшчэ ў комсамольскіх колектывах Менбелпэдтэхнікуму і Політэхнікуму сувязі

Па вышэйшых і сярэдніх навучальных установах БССР разгортваецца справаздачна-перавыбарчая кампанія бюро ячэек. Гэтая кампанія павінна прайсьці пад знакам яшчэ большай мобілізацыі комсамольцаў і беспартыйнага студэнцтва на выкананьне рашэньняў партыі аб падрыхтоўцы чырвоных спэцыялістых для народнай гаспадаркі.

Матэр'ялы аб перавыбарах у Менскім політэхнікуме сувязі і Белпэдтэхнікуме з усёй яскравасьцю выяўляюць опортуністычную работу кіраўніцтва колектываў гэтых установ.

Акадэмпасьпяховасьць, быт, політвучоба выпалі з пляну работы гэтых ячэек і колектываў.

Ня менш шкодную ўстаноўку ўзяло бюро комсамольскага колектыву Белпэдтэхнікуму ў галіне росту комсамольскай організацыі. Трэба раз на заўсёды запамятаць, што барацьба за шматмільённы комсамол ня толькі справа вытворчых і колгасных ячэек. Маладыя рабочыя і батракі з ліку студэнцтва пры індывідуальным адборы могуць і павінны быць у комсамоле.

Пры зачыненых дзьверах...

За год вучобы ячэйка Політэхнікуму сувязі (Менск) ня справілася з сваімі задачамі.

Ячэйка зусім не займалася акадэмічнымі пытаньнямі. Соцспаборніцтва ў тэхнікуме не разгорнута. Нават невядома колькі ў тэхнікуме ўдарнікаў.

Не вялася барацьба з прагульшчыкамі-зрыўшчыкамі выкананьня навучальных плянаў.

Гэтыя прарывы тлумачацца і тым, што партыйная ячэйка і колектыў сувязі зусім не кіравалі комсамолам. У політэхнікуме 250 студэнтаў, большасьць з іх рабочыя ад варштату, батракі і колгасьнікі. У ЛКСМБ прынята за год толькі 15 чалавек. Комсамольская ячэйка мае 70 чалавек, дзе 40 проц. усёй моладзі. У КП(б)Б перададзены толькі 1 чалавек. Гурткі па падрыхтоўцы ў партыю ня створаны. У ліпені месяцы „Чырвоная Зьмена“ узнагародзіла ячэйку політэхнікуму сувязі ордэнам вярблюда за ганебныя тэмпы росту.

Бюро ячэйкі нічога не пастаралася зьняць з сябе гэтую пляму. Сакратар партыйнай ячэйкі Касьпяровіч кіраваў ячэйкаю так:—„Вось вам дырэктывы і працуйце“. Партпрымацаваны амаль ніколі ня прысутнічаў ні на бюро, ні на сходах ячэйкі.

У тэхнікуме пытаньне нацыянальнай політыкі асабліва беларусізацыі сустрэла супраціўленьне з боку шмат якіх студэнтаў. Нідзе не пачуеш беларускага слова. Зусім не вывучаецца літаратура, эканоміка і гісторыя Беларусі.

Рашэньні зьезду рабселькораў не прапрацаваны, з пачатку навучальнага году прайшоў месяц, а насьценгазэты ніводнага нумару не выпушчана.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія ячэйкі прайшла пры зачыненых дзьверах.

Ніводзін беспартыйны студэнт у гэтай кампаніі ўдзелу не прымаў. Сакратар комсамольскай ячэйкі Баран на перавыбарчым сходзе заявіў: „Мяне не выбірайце ў бюро, бо я працаваць ня буду“.

Ён імкнуўся замазаць вочы і скрыць прарывы ў ячэйцы. Ён хацеў „паказаць“, што „ў колектыве ўсё добра“.

Самаправерачныя брыгады не працавалі і нават ня былі складзены. Менскі Гарком ЛКСМБ павінен зараз-жа рэагаваць на вышэй пададзеныя факты.

Г. Фрыд.

Факты галасуюць за зьмену кіраўніцтва

З новымі, павышанымі задачамі, якія сталі перад комсамольскай організацыяй, колектыў ЛКСМБ менскага Белпэдтэхнікуму далёка ня справіўся. Выхаваньне новых кадраў політэхнічна адукаваных чырвоных пэдагогаў для новай політэхнічнай школы бюро колектыву і ячэек мала аддавала ўвагі.

Задачы барацьбы за 100 проц. ахоп рабочай і батрацкай моладзі комсамолам прайшлі міма комсамольскага колектыву.

45 чалавек рабочых і батракоў знаходзяцца па-за радамі комсамолу.

Колектыў нічога ня робіць, каб уцягнуць іх. Адсутнасьць росту бюро колектыву матывуе тым, што пастановы ЦК УсеЛКСМ аб шматмільённым комсамоле датычыць выключна вытворчых комсамольскіх організацый, а не навучальных установ.

У час манэўраў СПА колектывам была вывешана абвестка наступнага зьместу: „У сувязку з манэўрамі абвяшчаем прыём у рады ЛКСМБ“. Пра дзедаўскія мэтоды вярбоўкі ў комсамол і ніякай індывідуальнай работы з рабоча-батрацкай моладзьдзю!

За ўвесь год комсамольскі колектыў павялічыўся толькі на 8 чалавек. У партыю перададзены толькі двое.

Навічкі (як і старыя комсамольцы) не ахоплены політ. і вайсковай вучобай. Навічкі не зьяўляюцца змагарамі за акадэмічныя пляны.

Палова студэнтаў перайшла з нязданымі залікамі на другі курс. Галоўная прычына акадэмічнай непасьпяховасьці—дрэнны быт. Да гэтага часу ў інтэрнатах ня вызначылі сталых гадзін для з'чэрніх засадмічных заняткаў. Колектыў пераклаў усю клопату быту студэнтаў на шкловадзю.

У тэхнікуме зьявіліся розныя нацыянал-дэмократычныя „тэорыі“. Студэнт Гайка высоўваў „тэорыю“ аб неабходнасьці пераходу на лацінскі альфабэт. Нацдэмаўскія творы Пушчы і Дубоўкі некаторымі студэнтамі насіліся на руках. Былыя студэнты Вашына, Калюга, Астрэйка, Русаковіч, Будзько адмаўляліся ад зьместу, а напіралі на форму ў літаратуры.

Колектыў комсамолу слаба мобілізоўваў студэнцкія масы на барацьбу з нацдэмократызмам, дрэнна выхоўваў з мас студэнтаў барацьбітоў за генэральную лінію партыі, ня вёў працы па інтэрнацыянальнаму выхаваньню. У барацьбе з нацдэмократызмам друк тэхнікуму—насьценныя газэты—занялі апошняе месца.

* *
*

Перавыбары бюро колектыву, якія адбудуцца гэтымі днямі, павінны зрабіць рашучы пералом у рабоце комсамольскай організацыі тэхнікуму. Кіраўніцтва, якое ня здолела мобілізоўваць масы, павінна быць зьнята.

Кавалевіч.

Так ня выконваюць дырэктывы партыі

Рад школ не пачыналі яшчэ нармальнай работы

Па-баявому перабудаваць работу ў галіне ўсенавучу адпаведна з рашэньнямі партыі

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе зьяўляецца конкрэтнай, баявой програмаю дзейнасьці комсамольскіх організацый. Комсамол на грунце гэтай пастановы павінен распрацаваць плян сваёй дзейнасьці ў раёне, колектыве і ячэйцы.

Але зьмешчаныя факты сьведчаць аб тым, што ў некаторых раёнах яшчэ недацанілі неабходнасьць як найхутчэй правесьці ў жыцьцё пастанову ЦК партыі аб школе.

Комсамол, як шэф усенавучу, павінен ператварыць дні, якія засталіся да сьвяткаваньня XIУ гадавіны Кастрычніка, у штурмавыя дні па ліквідацыі прарываў усенавучу, палепшаньні працы школ у адпаведнасьці з пастановаю партыі.

К XIУ Кастрычніку ўсе школы павінны быць адрамантаваны і працаваць без перабояў. Трэба больш бязьлітасна павесьці барацьбу супроць правых і „левых“ опортуністых у навучаньні.

Комсамол павінен прыйсьці да Кастрычніцкіх сьвят з конкрэтнымі перамогамі ў галіне ажыцьцяўленьня пастановы ЦК УсеКП(б) аб школе.

Забясьпечыць бесьперабойную работу тэхнікуму

Мазырскі пэдтэхнікум павінен прыняць на 1-ы курс 120 асоб.

Падана толькі 104 заявы, з іх рабочымі толькі 17, колгасьнікамі 34.

Яшчэ горш укомплектоўваюцца пэдкурсы: на 80 месц падана толькі 8 заяў (10 проц.).

На заняткі старэйшых курсаў не зьявіліся 37 асоб, з якіх 9 комсамольцаў.

Зараз-жа трэба прагнаць з комсамолу лятуноў-рвачоў і забясьпечыць бесьперабойную работу тэхнікуму.

Підарэнка і Зайцаў.



Ачагі цемры ператварыць у інтэрнаты для студэнтаў

35 гарадзкіх школ Віцебску патрабавалі сёлета рамонту. Рамонт і будаўніцтва гарсавет перадаў будаўнічай канторы. Кантора з будаўніцтвам ня справілася. Адрамантаваная 21-я сямігодка ня мае асьвятленьня. Вучні вячэрняй зьмены займаюцца пры газоўцы, што адбіваецца на якасьці прапрацоўкі програмы.

Для новага набору ў ФЗВ не хапае інтэрнатаў. Між тым зачыненыя цэрквы (на Савецкай вуліцы, пры нязначных затратах, могуць быць прыстасаваны пад інтэрнаты для студэнтаў і вучняў.

Востра стаіць пытаньне са сталоўкамі для вучняў.

Гарсавет і інспэктура нарасьветы павінны частку закрытых цэркваў абсталяваць пад інтэрнаты і сталоўкі для навучальных устаноў Віцебску.

Пост „Ч. З.“

Ваўчок і Усыскін.

Так не ажыцьцяўляюць пастановы партыі

Прудзінскі сельсавет (Друсенскі раён) конкрэтна не пачаў яшчэ праводзіць у жыцьцё пастанову ЦК партыі аб пачатковай і сярэдняй школе.

На нараду асьветнікаў сельсавету, ня гледзячы на запрашэньне, не зьявіліся старшыні сельсавету, сельпо і колгасу. І не выпадкова—гэта вынік недаацэнкі ўсенавучу.

У сельсавеце няма ніводнае сапраўды політэхнічнае школы. Вучні дрэнна наведваюць школу, бо ня маюць абутку. Валынецкая шавецкая майстэрня, дзе рамантуецца вучнёўскі абутак зацягвае заказы. Ужо некалькі раз чуем адно і тое-ж: „паправім праз два тыдні“.

Зусім дрэнна забясьпечваецца пастаўніцтва.

Усе гэтыя факты праходзяць міма сельсавету і комсамольскай організацыі. Пастанова ЦК партыі аб школе яшчэ не разварушыла сельсавет.

Трэба неадкладна ўзяцца за ліквідацыю ўсіх гэтых недахопаў.

Комсамол сельсавету, як шэф усенавучу, павінен у гэтым праявіць сваю ініцыятыву.

Юрка Сьнегавы

Даць інтэрнат ШКМ

Пры Стара-Даросвай ШКМ няма інтэрнату. Дзеці колгасьнікаў і беднаты робяць прагулы, бо некаторым прыходзіцца хадзіць за 10 кілёмэтраў.

РВК павінен зараз-жа забясьпечыць ШКМ інтэрнатам.

Комсамолец

Выканаць разьвёрстку гаркамолу

Віцебск. У заўпэдтэхнікум павінна быць прынята 120 чалавек, а пададзена толькі 40 заяў. Разьвёрстка Гаркамолу ня выконваецца і ніхто за гэтым ня сочыць.

Віцебскаму Гаркамолу трэба праверыць, як выконваецца разьвёрстка і не дапусьціць зрыву навучальнага.

Ваўчок.

Пуцёўка ў руках

Па-ўдарнаму рэалізуем маршруты

Комсамольскі колектыў менскай абутковай фабрыкі практычна прыступіў да рэалізацыі сталінскай пуцёўкі.

Ва ўсіх ячэйках распрацаваны конкрэтныя мерапрыемствы па палепшаньню якасьці продукцыі і выкананьню програмы чацьвертага кварталу.

Комсамольскі колектыў сумесна з ТНБ фабрыкі намеціў рад конкрэтных мерапрыемств па ліквідацыі ўраўнілаўкі ў заработнай плаце.

Усе рабочыя фабрыкі прымацаваны к машынам і варштатам.

Разгортваецца падрыхтоўка да пераводу маладзёжных зьмен машыннага і закройнага цэхаў на гаспадарчы разрахунак. Комсамольскі колектыў гэтымі днямі слухаў даклад загадчыка ЗРК. Колектыў падкрэсьліў, што комсамольцы амаль ня ўдзельнічалі ў працы ЗРК і сталоўкі. Колектыў ўзяў шэфства над ЗРК. Комсамольцы штодзённа дзяжураць у сталоўцы.

Ячэйкамі распрацоўваюцца мерапрыемствы, каб дапамагчы партсрганізацыі і адміністрацыі ў наборы рабочай сілы і падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых. Комсамольцы закройнага цэху шэфствуюць над маладзёжнаю групай, дзе рыхтуюцца кваліфікаваныя закройшчыкі.

На фабрыцы організаваны курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ. Комсамольцы прымаюць актыўны ўдзел ва ўкомплектаваньні.

Удзел комсамольскай організацыі ў вытворчым жыцьці фабрыкі цесна ўвязваецца з ростам комсамолу і яго замацаваньнем. За апошні час у комсамол прынята каля 50 чал. маладых рабочых.

Лёў.

Да пленуму ВСФКБ

РАШЭНЬНЕ ЦК КП(б)Б—У АСНОВУ ПЕРАБУДОВЫ ФІЗКУЛЬТУРНАГА РУХУ

Сёньня пачынае сваю працу пленум Вышэйшага Савету Фізкультуры БССР.

Фізкультурнікі Савецкай Беларусі, на падставе рашэньняў ЦК УсеКП(б) „аб фізкультурным руху“, дабіліся пералому ў справе падпарадкаваньня фізкультурнай работы задачам разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва.

Аднак, ня гледзячы на наяўнасьць посьпехаў, усё ж фізкультурны рух у БССР знаходзіцца ў нездавальняючым становішчы.

Ня выканаы асноўныя дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб ахопе шырокіх мас рабочых і работніц фізычнай культурай. З 260 тысяч членаў профсаюзаў фізкультурай ахоплены толькі 21 тыс. членаў.

На буйнейшых прадпрыемствах БССР, дзе налічваецца ад 1000 да 3000-4000 рабочых, фізкультурным рухам ахоплена зусім мізэрная колькасьць рабочых. Так, на Гомсельмашы фізкультгурткамі ахоплена 100 чал., „Чырвонай Бярэзіне“—70 ч., заводзе імя Варашылава — 70, шоўкавай фабрыцы—98.

Яшчэ горш з становішчам фізкультуры на вёсцы.

Толькі 2000 фізкультурнікаў на 50 проц. колектывізаваных гаспадарак БССР.

У практыцы ахопу працоўных фізкультурнай пануе поўная стаўка на самацёк.

Ня выканана таксама дырэктыва партыі аб ахопе фізкультурнікаў ударніцтвам і соцспаборніцтвам. Каля 30 проц. фізкультурнікаў зьяўляюцца ўдарнікамі.

Усе гэтыя прарывы атрымаліся толькі з-за таго, што ВСФКБ і мясцовыя саветы фізкультуры недастаткова скарысталі ўзрослую грамадзка-політычную актыўнасьць мас фізкультурнікаў для разгортваньня масавасьці ў фізкультурным руху і ў асаблівасьці ў галіне палепшаньня якасьці паказчыкаў працы яго (вучэбна-спартыўнай) пры зусім слаба разгорнутай самакрытыцы (з пастановы бюро ЦК КП(б)Б.

Комсамольская організацыя, ня гледзячы на рад указаньняў IX і XI з'ездаў ЛКСМ, па сёньняшні дзень дрэнна павярнулася тварам да фізкультурнага руху.

Таму пленум, які сёньня пачынае сваю працу, павінен вызначыць далейшыя шляхі работы фізкультурных організацый Беларусі ў новых умовах у новых абставінах соцыялістычнага будаўніцтва. „Мэтоды фізкультурнай работы павінны быць максымальна выкарыстаны для садзейнічаньня задач падвышэньня продукцыйнасьці працы і ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны“ (IX зьезд УсеЛКСМ).

Фізкультурнікі Беларусі павінны змагацца за ідэйную чыстату фізкультурных радоў, падвышэньня якасьці грамадзка-політычнага выхаваньня мас фізкультурнікаў.

Трэба рашуча змагацца з рознымі „тэорыямі“, якія імкнуцца скажаць лінію партыі ў фізкультурным руху. Гэтыя „тэорыі“ выяўляюцца ў падмене грамадзка-політычнага выхаваньня мас фізкультурнікаў спартыўным дзеляцтвам. Гэтая аполітычнасьць зьяўляецца галоўнай небясьпекай у фізкультурным руху.

Перабудова ўсёй сыстэмы і мэтадаў работы па вытворчаму прынцыпу падпарадкаваньне іх задачам соцыялістычнага будаўніцтва і абароны краіны—вось лёзунгі, якія павінны стаць рэчаіснасьцю.

Кожны фізкультурнік-ударнік, кожны ўдарнік-фізкультурнік,—вось баявая задача дня.

Колгасцэнтр, Наркомасьветы, ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ на аснове рашэньняў ЦК КП(б)Б павінны, нарэшце, па сапраўднаму павярнуць свае організацыі тварам да фізкультурнага руху.

Фізкультурныя організацыі павінны разгарнуць баявую работу па здачы норм на значок „Гатоў да працы і абароны“. Задача „ахапіць здачай норм ня менш 25 тыс. фізкультурнікаў і працоўных БССР да 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі“ павінна быць ня толькі выканана, але і перавыканана.

Пленум павінен яшчэ больш мобілізаваць шырокія масы фізкультурнікаў вакол ажыцьцяўленьня чарговых задач фізкультурнага руху на аснове рашэньняў ЦК КП(б)Б.

Х. Б

На барацьбу з бездарожжам

НАБЛІЖАЕЦЦА УСЕБЕЛАРУСКІ СУБОТНІК

Райкомы, ячэйкі, комсамолія! Разгортвайце падрыхтоўку да суботніку

Правільна расставіць сілы, абраць галоўныя зьвеньні работы — посьпех суботніка будзе забясьпечан

„БЯЗ ФОРДА НЯПРЫСТОЙНА“

Гомельскія партыйныя і комсамольскія організацыі сваечасова адгукнуліся на пастанову ЦБ партыі і адозву ЦБ комсамолу аб месячніку штурму ў выкананьні пляну дарожнага будаўніцтва, вынесьлі прыгожыя рэзолюцыі, склалі штаб з удзелам розных організацый і г. д.

Але члены штабу ня цікавяцца ходам работ, ні разу ня былі на дарозе. Па сёньня сельскія саветы, калгасы і саўгасы ня ўдзельнічаюць у месячніку штурму. Штаб ніякіх мер ня прымае, нібы гэта не яго справа. Ні разу ніхто ня быў у сельсавеце: няма, бачыце, легкавога форда, а так „няпрыстойна“ езьдзіць у сельсаветы.

Комсамольскія організацыі таксама абыякава адносяцца да гэтай справы. Да гэтага часу адпрацавана ўсяго 300 працадзён, і то за лік гарадзкіх ячэек. Вясковыя ячэйкі ў штурме зусім ня ўдзельнічаюць, растлумачальнай працы не праводзяць. Комсамольцы, якія прыходзяць на суботнікі, не ўяўляюць важнасьці дарожнага будаўніцтва, замест ударнай работы латруюць. Былі выпадкі, што комсамольцы закапвалі лапаты, тапары і самі ўцякалі дадому, а гаркамол гэта мала абыходзіў.

Па пастанове ЦБ ЛКСМБ Гомельскі гаркамол павінен быў мобілізаваць на дарбудаўніцтва 30 комсамольцаў. Да гэтага часу мобілізавана толькі 3. Гарпрафсавет зусім гэтым ня цікавіцца. Іншыя організацыі хоць ставілі пытаньне на паседжаньнях, а Гомельскі гарпрофсавет і гэтага нават не зрабіў.

Газэта „Палеская праўда“ таксама „уключылася ў штурм“ і па—„штурмавому“ асьвятляе яго ход: пастанову гаркому ад 17-IX зьмясьціла толькі 5-X, (у іх бачыце таксама ёсьць важнейшыя справы).

Грамадзкія організацыі Гомельшчыны—Аўтадор, АСОавіяхэм, МОПР ў штурм таксама ня ўключыліся.

Аўтадор паслаў толькі аднаго прадстаўніка на вёску, а іншыя і гэтага не зрабілі. Адпаведным організацыям трэба зацікавіцца ходам штурму па Гомельшчыне, каб пакласьці канец опортуністычнай недаацэнцы дарожнага будаўніцтва і стаўцы на самацёк, каб пасьпяхова выканаць у месячнік штурму дарфінплян трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Бэнін.

Адказаць: ёсьць! Мы гатовы!

Загад па Галоўдартрансу БССР і Белдарбудзе ад 13—X 1931 г.

Ухваляючы ініцыятыву ленінскага комсамолу Беларусі ў правядзеньні Усебеларускага 2-х дзённага суботніка па барацьбе з бездарожжам ад 20 па 26—X-1931 г., Галоўдартранс і Белдарбудаб'яднаньне прапануе:

Усім кіраўнікам лінейных дарожных організацый сваечасова ўмовіцца з адпаведнымі райкомамі, ячэйкамі ЛКСМБ, прылягаючымі да тэрыторыі іхняга вучастку, аб правядзеньні ў жыцьцё пастановы ЦК ЛКСМБ высьніўшы магчымую колькасьць удзельнікаў суботніку.

Пад асабістую адказнасьць начальнікаў дыстанцый, тэхнікаў вучасткаў і вучдораў падрыхтаваць контрэтныя пляны работ, каб больш поўна і з большай эфэктыўнасьцю скарыстаць усіх удзельнікаў у суботніку.

У вызначаныя дні правядзеньня суботніку ні ў якім разе не дапушчаць прастояў з-за дрэннай організаванасьці, з-за адсутнасьці струмантаў і іншых вытворчых прыладаў, а таксама з-за адсутнасьці тэхнічнага нагляду. Н ў якім разе не дапушчаць зрыву вялікага пачынаньня ленінскага комсамолу, усямерна садзейнічаючы пераварэньню суботніка ў масавы паход за выкананьне дарожнага пляну 1931 г. у барацьбе з бездарожжам.

Віноватыя ў зрыве суботніку будуць прыцягнуты да адказнасьці.

Аб праведзеным суботніку, колькасьці ўдзельнікаў з іх комсамольцаў і праробленай працы прадставіць зводкі.

Нач. Галоўдартрансу БССР Паўлоўскі.
Нач. Белдарбуду Нацарэнус

Зводка гэроічных будняў

ЧЭРВЕНЬ. За адну пяцідзёнку адпрацавана комсамольцамі 321 працадзень на дарбудаўніцтве.

БАБРУЙСК. За тры пяцідзёнкі адпрацавана комсамольцамі 563 працадні.

КРАСНОПОЛЬЛЕ. За тры пяцідзёнкі адпрацавана 663 працадні.

СЛУЦАК. За тры пяцідзёнкі комсамольцамі адпрацавана 214 працадзён.

Адстаюць р-ны: Дрысенскі, Клічаўскі, Камарынскі, Кармянскі, Касцюковіцкі, Быхаўскі, Барысаўскі, Бягомельскі, *Менскі*, Вузьдзенскі, Чэрыкаўскі.

Пакуль што адзінкі

Удзел комсамольцаў у дарбудаўніцтве Гомельскага раёну надта дрэнны. Дагэтуль адпрацаваныя дні налічваюцца адзінкамі.

Беспартыйная моладзь слаба прыцягваецца да ўдзелу у суботніках.

Спынеце блытаніну і сьвістапляску лічбаў—адчынеце вароты будоўлі фабрыкі-кухні

Створаем скразны комсамольскі кантроль за будоўляй

Гэтымі днямі ў рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“ адбылася нарада на пытаньню аб стане будаўніцтва фабрыкі-кухні. Нарада заслухала інформацыі: старшыні аддзяленьня Менбу у тав. Дэйча, прадстаўнікоў Белдзяржснабу, адміністрацыйна-тэхнічнай часткі пабудовы, прадстаўніка будаўнічай сэкцыі ЦКК—РСІ. Нарада пастанавіла стварыць скразны кантроль над будаўніцтвам фабрыкі-кухні. Для кіраўніцтва вылучан штаб у складзе 7 асоб.

Трэба адзначыць недапушчальныя адносіны бюро Менгаркому ЛКСМБ, прокуратуры і Дзяржпляну, якія, ня гледзячы на неаднакратныя запрашэньні, на нараду не зьявіліся.

Па ўсім Менску разгорнута вялізарнае будаўніцтва. Вырастаюць новыя фабрыкі і заводы, будуюцца новыя цэхі, культурныя ўстановы і дамы для рабочых. У прамысловасьць уліваюцца сотні і тысячы новых рабочых. Становяцца вузкімі асноўныя цэхі прадпрыемства—сталоўкі.

У маі 1930 году пачалося будаўніцтва фабрыкі-кухні. Згодна адпаведным рашэньням фабрыку трэ' было скончыць к 1 мая 1931 г. Рабочы колектыў з энтузіязмам узяўся за будаўніцтва; працавалі звыштэрмінова, у выхадныя дні.

Аднак, у самы разгар працы пачалі вывозіць гатунковае жалеза з пабудовы.

За зіму былі гатовы рад арматурных работ, якія складаюць асноўную частку ў будаўніцтве фабрыкі-кухні. Каля 800 кубамэтраў гатовага перакрыцьця зімавала бяз даху—ня было лесаматар'ялаў.

Увесну падрыхтаваліся бэтанаваць гатовае перакрыцьце, але тут з Масквы прыбылі новыя чэрцяжы. Усё, што было зроблена за зіму, прышлося перарабляць. На гэтую пераапрацоўку затрацілі ўвесь будаўнічы сэзон 31 г.

З першага-ж дня работ дахавае жалеза, патрэбнае ў канцы будаўніцтва было цалкам нарыхтавана. Асноўных матар'ялаў (цэглы, леса і піламатар'ялаў, цьвікоў, аліфы) ня было.

Белкоопсаюз, МЦРК і інш. установы бачылі свой удзел у кіраўніцтве пабудовай толькі ў прадстаўленьні фондаў на розныя матар'ялы, асабліва на жалеза, цьвікі, цэмант—як матар'ялы, ад якіх залежыць усё будаўніцтва. Аднак і жалеза фабрыка-кухня не атрымала.

Каб закончыць пабудову, патрэбна мець 100 тон гатунковага жалеза, 360 тон портляндзкага цэманту, 9 з пал. тон цьвікоў, 750 кубамэтраў лесаматар'ялу, 150 тыс. цэглы,—гэтыя лічбы высьветлены на нарадзе, якая адбылася ў „Чырвонай Зьмене“. Дагэтуль была поўная блытаніна. Не вядома было колькі патрэбна матар'ялу. Установы ня ішлі насустрач будаўніцтву фабрыкі-кухні, ня ведалі нават, хто адказвае за будаўніцтва і забясьпечаньне матар'ямі.

10 верасьня, пасьля апошняй бэтоніроўкі, будаўніцтва фабрыкі-кухні спынілася. Рабочых адправілі на іншыя об'екты, пачалі нават вывозіць матар'ялы (цэглу, цэмант) на іншыя пабудовы. Начальнік работ—партыец пакінуў пабудову. Тэхнічнае кіраўніцтва пабудовы сумесна з комсамольскай ячэйкай пачало штурмаваць установы, ад якіх залежыць прадстаўленьне неабходных матар'ялаў. У Белснабе хацелі адчапіцца ад фабрыкі-кухні, заяўляючы, што пабудова ад Белснабу адышла і прымацавана да Белдзяржбуду. Цэлы тыдзень вадзілі за нос адміністрацыю і прадстаўнікоў ячэйкі пабудовы, матар'ялаў не давалі. „Чырвоная Зьмена“ склікала тэрміновую нараду па гэтаму пытаньню. Але характар нарады яскрава паказаў, што належныя організацыі ня хочуць выконваць пастанову партыі і ўраду аб грамадзкім харчаваньні.

Асабліва ясна гэта выявілася з выступленьня новага начальніка работ пабудовы фабрыкі-кухні партыйца тав. Ляўкова. Ён заявіў, што ўрад і ЦК партыі ўведзены ў заблуджэньне, дзякуючы чаму ўстанавілі такі „нерэальны“ тэрмін скончаньня будаўніцтва фабрыкі-кухні—як 1 студзеня 1932 году. З боку прадстаўнікоў рэдакцыі і комсамольскай організацыі гэта выступленьне атрымала належны адпор.

Нарада пастанавіла ўстанавіць скразны кантроль над будаўніцтвам фабрыкі-кухні, для сваячасовага выкананьня пастаноў партыі.

Мы патрабуем спыніць цяганіну, якую зацеяў Белснаб. Дзяржплян павінен выканаць пастанову ЦК партыі.

Мы просім камісію праверкі пры Саўнаркоме прасачыць за выкананьнем пастановы партыі і ўраду аб будаўніцтве фабрыкі-кухні.

Зрыўшчыкі будаўніцтва фабрыкі-кухні павінны панесьці суровую адказнасьць. Пастанова партыі павінна быць выканана.

Б—к.

Ворша

Выязная рэдакцыя „Ч. З,“ і „К.Б. „Ю А“

З ГАСПАДАРЧЫМ РАЗРАХУНКАМ НА ШТУРМ ПРАРЫВАЎ

Перавод паравозаў на гаспадарчы разрахунак на Аршанскім вузьле пачаўся па ініцыятыве саміх паравозных брыгад.

Ня гледзячы на закаранеласьць, баязнь, павольнасьць адміністрацыі, а часам і простае ігнараваньне, гаспадарчы разрахунак прабіў сабе дарогу і атрымаў права на жыцьцё, як форма, што найлепш забясьпечвае выкананьне задач соцыялістычнага будаўніцтва. Аб выніках пераходу на гаспадарчы разрахунак паравозаў гавораць наступныя факты.

Брыгада на паравозе ОВ № 4663 *за* жнівень м-ц зэкономіла на рабсіле 356 р. 78 кап., на матар'яле 44 р. 52 кап., мазуце 18 р. 05 к.

Брыгада т. т. Джонса і Любецкага на паравозе Щ №-2211 за жнівень з экономіла на рабсіле 232 р. 83 к., на матар'яле 35 *р*. 46 к.

Комсамольскі паравоз брыгады к-цаў Елімкоўскага і Яна шэўскага за жнівень м-ц зэкономілі на рабсіле 163 р. о9 к. на матар'яле 28 р.

***З ліпеня* аршанскае ДЭПО з усімі сваімі адзінкамі перайшло на гаспадарчы разрахунак.**

***Толькі* 9 паравозаў за адзін жнівень м-ц далі агульную экономію 1774 р. 03.**

Але, ня гледзячы на зусім яўныя перавагі гаспадарчага разрахунку на паравозах—ён усё-ж такі натыкаецца яшчэ на супраціўленьне адміністрацы.

Вакол гаспадарчага разрахунку не разгарнулі яшчэ сапраўды масавай работы ні гаспадарчыя ні прафэсыянальныя організацыі.

Пры пераводзе паравозаў на гасп. разрахунак у большасьці бяруцца сярэднія нормы, ня ўлічваецца стан паравозу.

Дапамога і кіраўніцтва мясцкомаў у рабоце гаспадарча-разрахунковых брыгад зусім слаба адчуваюцца. Не практыкуецца заслухоўваньне вынікаў работы брыгад, няма практыкі, каб у працэсе работы можна было-б выправіць заўважаную нерэальнасьць дагавору.

Асабліва дрэнна на вузьле пастаўлен вучот вынікаў гаспад. разрахунку. Кантора вузла яшчэ не наладзіла работы так, каб ведаць штодня вынікі і твар гаспадарчага разрахунку.

Некаторыя брыгады няправільна зразумелі гаспадарчы разрахунак. Паасобныя машыністыя ў пагоні за большай экономіяй рамантуюць паравозы самі, саматужным спосабам, перапрацоўваюць свае гадзіны звыштэрмінова.

Нельга дапускаць, каб рамонт,—справа ДЭПО—праводзіўся самой брыгадай, ды яшчэ і саматужным спосабам. У некаторых дагаварох малое месца займаюць элементы грамадзкасьці (сустрэчныя па выкананьні вымернікаў, вывучэньне тэхнікі, дапамога адстаючым паравозам і г. д.). Без элементаў грамадзкасьці дагавары носяць штампаваны характар. Гаспадарчы разрахунак зьяўляецца моцным вагаром грамадзкага ўзьдзейнічаньня, ён уносіць элементы конкрэтнасьці ў соцспаборніцтва і ўздымае яго на новую, вышэйшую ступень.

Комсамол вузла за апошні час дабіўся значных посьпехаў у павароце тварам да задач транспорту. Аднак, барацьба за гаспадарчы разрахунак усё яшчэ—слабое зьвяно работы—між тым як гэта асноўная задача на транспарце. Паравозы, якія перайшлі на гаспадарчы разрахунак, зьяўляюцца лепшымі.

Змагацца за перавод усіх паравозаў на гаспадарчы разрахунак—такава задача дня транспортнага комсамолу.

І Фіялкін

За тэхнічны карантын галасуе жыцьцё

На гомельскім дрэваапрацоўчым комбінаце пачалі складаць тэхмінімум для карантыну

„Чырвоная Бярэзіна“ павінна падхапіць пачын комбінату

Гомель
(*Наш спэцкор*)

Тэхнічны карантын на дрэваапрацоўчым комбінаце

Выпрацаваць тэхмінімум—такава задача

8 кастрычніка ў габінэце галоўнага інжынера Гомельскага дрэваапрацоўчага комбінату адбылася тэхнічная нарада з удзелам усіх загадчыкаў цэхаў па пытаньню ўвядзеньня аднаго з сродкаў тэхнічнай падрыхтоўкі рабочых—тэхнічнага карантыну ў цэхах комбінату, частка якога ўступае ў строй да Кастрычнікаўскіх сьвят.

— Тэхнічны карантын каштоўны тым,—кажа галоўны інжынэр комбінату,—што ажыцьцяўленьне яго значна павышае ўжо з першых дзён працы рабочага яго вытворчыя магчымасьці.

Тэхнічны карантын павінны прайсьці ўсе рабочыя, якія працуюць у цэху, сюды адносіцца і падсобная рабочая сіла.

Ад карантыну аслабаняюцца толькі рабочыя высокай кваліфікацыі, якія праходзяць спэцыяльныя доўгатэрміновыя курсы. Адна з асаблівасьцяй тэхнічнага карантыну ў тым, што ён укладае тэхнічнае навучаньне рабочага ў пэўную сыстэму.

Падрабязна абгаварыўшы пытаньне тэхнічнага карантыну, нарада ўмовілася праводзіць яго наступным чынам: агульныя веды, якія датычаць усяго цэху, як, напрыклад, асновы тэхнолёгіі дрэва, адносіны да яго, тэхніка бясьпекі і інш., прапрацоўваюцца з усімі рабочымі цэху.

Пытаньне апрацоўкі дрэва прапрацоўваецца з групай рабочых, якія непасрэдна апрацоўваюць дрэва.

Тэхніка апрацоўкі сьпіцы прапрацоўваецца групай рабочых стужкі па выпрацоўцы сьпіцы.

Варштат і праца на ім вывучаецца з тымі рабочымі, якія працуюць на аднолькавых варштатах.

У зьвязку з організацыяй тэхнічнага карантыну зараз праводзіцца рэйд юнкораўскіх брыгад „Чырвонай Зьмены“ і „Палескай Праўды“ па пытаньню вярбоўкі і падрыхтоўкі рабсілы для комбінату. Юнкор-брыгады правераць працу ФЗВ, курсаў качагараў, масавых профэсый і інш.

Усе ўдзельнікі нарады зараз распрацоўваюць праграму тэхнічнага мінімуму для карантыну, які ў бліжэйшыя дні будзе надрукаваны ў газэце.

Шапіра.

На Бярэзінскім комбінаце тэхвучоба правалена

Н-Барысаў 14-Х (БЕЛТА). Да Бярэзінскім комбінаце правалена справа аўладаньня тэхнікай. Вылучаныя ПТС і фабкомам камісія для наладжваньня тэхвучобы бязьдзейнічае,—не організавана ніводната тэхгуртка.

Гадзіна абавязковай тэхвучобы сарвана, навучальных плянаў няма, настаўнікамі гурткі не забясьпечаны.

Толькі зараз, па ініцыятыве парткому, пры Барысаўскім запалкавым тэхнікуме організаваны вячэрні тэхнікум, які дасьць магчымасьць рабочаму атрымаць сярэднюю тэхнічную асьвету, не адрываючыся ад вытворчасьці.

Але гэтым тэхнікум разьлічаны на 40 чалавек малодшага адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу і ня зможа забясьпечыць комбінат патрэбнай колькасьцю кваліфікаванай рабочай сілы.

Зараз на фабрыку прыбыла вялікая колькасьць новых рабочых, не знаёмых з процэсам вытворчасьці, адгэтуль бадай штодня на фабрыках здараюцца аварыі і калецтвы.

XIV гадавіну Кастрычнікавае рэволюцыі сустрэнем 100 проц. выкананьнем плянаў ільнапенькazагатоўкі

Пастанова ЦК УсеЛКСМ аб удзеле комсамолу ў перапрацоўцы ільна і канапель і правядзеньні загатовак

1. ЦК адзначае, што рад комсамольскіх організацый да гэтага часу яшчэ не разгарнулі бальшавіцкіх тэмпаў барацьбы за лён і канапель, слаба забясьпечылі правільную організацыю працы ў колгасах (растаноўка сіл, увядзеньне зьдзельшчыны, улік працы) не разгарнуў масавага соцспаборніцтва і ўдарніцтва, а таксама масавай работы сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў аб значэньні сваячасовай уборкі і апрацоўкі лёну і канапель і здачы дзяржаве ільна-пянькі на 25 верасьня па Уральскай вобласьці выцераблена ільна 66,1 проц., канапель—10,0 проц. па Заходняй Сібіры: ільна—54,9 проц. і канопель—2,0 проц.

Выходзячы з гэтага, ЦК абавязвае крайкомы, абкомы і ЦК КСМ нацрэспублік ільнаводных раёнаў тэрмінова разгарнуць масавую работу па ўборцы, апрацоўцы лёну і канапель і хутчэйшаму правядзеньню ільна-пенька-загатовак пад лёзунгам: „Ніводнага кілёграму валакна і насеньня прыватніку“, зьвязваючы з далейшым умацаваньнем колгасна-саўгаснага будаўніцтва і організацыяй новага магутнага прыліву аднаасобнікаў—беднякоў і серадніякоў у колгасы.

2. Рашаючая роля ў пераапрацоўцы лёну і канапель належыць ручной пераапрацоўцы, выходзячы з гэтага комсамольскія організацыі ільна-канапляных раёнаў павінны дабіцца выкарыстаньня ўсіх маючыхся ў наяўнасьці тэхнічных магчымасьцяй па пераапрацоўцы для максымальнага павышэньня вытворчасьці працы колгасьнікаў і колгасьніц (конная драўляная мялка, апраўдаўшая сябе ў Заходняй вобласьці, ножнае трапала—бельгійскае кола). Увесьці сыстэму конвэеру,—бесперапыннасьць мяцьця, тропкі праўкі, зьвязкі і здачы гатовага валак на дзяржаве.

3. Ячэйкам і райкомам УсеЛКСМ ільнаканопляводных раёнаў ў поўна дагаворанасьці з адпаведнымі органамі забясьпечыць сваячасовасьць вярбоўкі і організаваны прыток рабочай сілы на ўноў пускаемыя ільнапенькаапрацоўчыя заводы.

4. Комсамольскім організацыям ільна-канопляводных раёнаў організаваць кантроль за сваячасовым давядзеньнем плянаў па загатоўцы ільна, пянькі да сяла, колгасу і контрактуемей гаспадаркі, праявіць ініцыятыву ў вылучэньні сустрэчных плянаў, організаваўшы сустрэчу 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі поўнай здачай гатовай ільнапенькавалакна пролетарскай дзяржаве.

5. Павесьці рашучую барацьбу з спэкуляцыяй і перакупкай ільна і пянькі, організаваць бесперасойны паток ільна-пянькі на загатоўчыя пункты, стварыць спэцыяльныя брыгады моладзі па перавозцы ільна і канапель, практыкуючы організацыю чырвоных комсамольскіх абозаў.

На ўсіх загат пунктах да пачатку загатовак організаваць стала-дзейнічаючыя агітпропбрыгады з комсамольцаў для правядзеньня масавай політычнай і культурнай работы з колгасьнікамі і аднаасобнікамі—беднякамі і серадніякамі.

6. Організаваць праверку стану загатпунктаў, падрыхтоўкі складзкіх памяшканьняў, забясьпячэньне інвэнтаром (вагар), кадрамі работнікаў. Дабіцца безадкладна ачышчэньня загатоўчых і пр ёмачных апаратаў ад кулацкіх і іншых клясава-чужых элемэнтаў. Вылучаць на работу па прыёмцы і сартыроўцы лёну і канапель комсамольцаў. Організаваць бесперабойную прыёмку ільна-пянькі з глыбінных пунктаў. Рашуча правесьці барацьбу з псаваньнем і крадзежам ільна-пянькі.

7. Камітэтам і ячэйкам УсеЛКСМ організаваць кантроль за правільным скарыстаньнем і сваячасовым забясьпечаньнем здатчыкаў прамтаварамі, іх хутчэйшым давядзеньнем да шырокіх мас здатчыкаў. скарыстаўшы вопыт комсамольцаў Іванава-Прамысловай вобласьці па організацыі чырвоных перасовачных павозак з промтаварамі.

8. Комсамольскім організацыям ільнаканопляводных раёнаў побач з організацыяй работ па пераапрацоўцы і загатоўцы ільна-пянькі ў колгасах організаваць з боку апошніх узяцьце на буксір аднаасобнага сэктару, паказаўшага значнае адставаньне ва ўборцы і ільнанасеньня загатоўках.

Разам з гэтым організаваць кантроль за поўнай і сваячасовай здачай цьвёрдых заданьняў па пераапрацоўцы і здачы валакна пянькі кулацка-заможнымі гаспадаркамі забясьпечыўшы безагаворачнае, поўнае выкананьне цьвёрдых заданьняў данымі гаспадаркамі.

Радыёграма

Усім сакратарам ГК і РК ЛКСМБ

Выкананьне сталінскай пуцёўкі і мобілізацыя мас комсамольцаў, моладзі рабочых і колгасьнікаў вакол ажыцьцяўленьня маршрутаў пуцёўкі ў большасьці раёнаў не распачата. ЦК абавязвае неадкладна ўключыць комсамольскія організацыі ў практычнае ажыцьцяўленьне маршрутаў пуцёўкі, дабіўшыся таго, каб Сталінская пуцёўка стала агульнай пуцёўкаю ў барацьбе за выкананьне прамфінколгаспляну. Аб ходзе рэалізацыі пуцёўкі падэкадна інформуйце ЦК і „Чырвоную Зьмену“.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ Гуткін

20-га—агульна-гарадзкі зьлёт юнкораў

Сёньня-ж пачаць падрыхтоўку да зьлёту

Новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва, 100 проц. выкананьне і перавыкананьне плянаў чацьвёртага кварталу 3-га рашаючага году пяцігодкі абавязваюць рабочую клясу і ўсіх працоўных напрудзіць усе сілы на пасьпяховае выкананьне намечаных плянаў.

Як удзельнічаюць і павінны ўдзельнічаць у гэтай рабоце юнкоры, як організаваць работу фабрычна-заводзкага друку на выкананьне прамфінпляну заключнага кварталу, на рэалізацыю програмнай прамовы тав. Сталіна—аб гэтым даведаешся на зьлёце юнкораў, які склікаецца рэдакцыяй газэты „Чырвоная Зьмена“ і Менскім Гаркомам КСМ 20 лістапада г. г., а 7 гадзіне ўвечары у Доме Навукі і Тэхнікі. Пытаньні наступныя:

а) рэалізацыя сталінскай пуцёўкі юнкораў;

б) ход выкананьня рашэньняў 2-га Усебеларускага зьезду рабсельваенкораў.

Камітэты і ячэйкі КСМ ва ўсю шырыню павінны разгарнуць масавую работу вакол зьлёту.

Уся падрыхтоўчая работа павінна праходзіць пад кутом погляду намячэньня конкрэтных мерапрыемстваў па ўзмацненьню кіраўніцтвам юнкоррухам і нізавым друкам.

Памятайце, што ад ударнай падрыхтоўкі будзе залежаць ударнае правядзеньне зьлёту.

Далі сустрэчны лёну


БОРКАВІЧЫ У парадку падрыхтоўкі да XIV гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі комуна „Новая культура“ і колгасы „Расьсьвет“ і „Прамень рэволюцыі“ па-ўдарнаму разгарнулі пераапрацоўку і здачу лёну.

Комуна „Новая культура“ і комсамольская ячэйка склалі дзьве комсамольскія брыгады па пераапрацоўцы лёну. Увесь лён абмалочаны, вымачаны і разасланы. Шэсьць га паднята з расьцілу, траста здадзена ільнозаводу Боркавічы.

У колгасе „Расьсьвет“ першапачатковая апрацоўка лёну пераведзена на зьдзельшчыну, нормы выпрацоўкі выконваюцца з перавышкай. Гэтымі днямі колгас пачынае здачу лёну.

Новаорганізаваны колгас „Прамень рэволюцыі“ скончыў церабіць лён са спазьненьнем, аднак энтузіязмам колгасьнікаў прырыў ліквідаваны. Колгасьнікі організавалі конвэер: выцераблены лён зараз-ж малацілі і мачылі. Колгас здаў заводу тону трасты.

Зусім адстаў у пераапрацоўцы лёну колгас „Клімаўшчына“ выцераблены в 40 га лён стаіць на полі, не абрэзаным. Работа праводзіцца падзённа, няма соцспаборніцтва і ўдарніцтва.



К 14 гадавіне Кастрычніка выканаем плян ільназагатовак

Колгас „Клімаўшчына“ павінен раўняцца па перадавых.

Юнкор Л.

Прыстасаваць лазьню пад сушыльню

Старыя-Дарогі. У колгасе „Новы селянін“ з-за непадрыхтаванасьці сушыльнага пункту ўзьняты з расьсьцілкі лён не пераапрацоўваецца. Сушыльны пункт будуецца марудным тэмпамі. Праўленьне колгасу не клапоіцца прыстасаваць лазьню, альбо іншыя надворныя будынкі пад сушыльню. Комсамольская ячэйка павінна ў гэтым узяць ініцыятыву, каб найхутчэй скончыць пераапрацоўку і здачу лёну.

М. П.

Лён здамо датэрмінова

Пухавічы. У выніку праведзенай комсамольскай ячэйкай Балоцкага сельсавету работы, бядняцка-серадняцкія гаспадаркі вёскі Хідра ўзялі на сябе абавязацельства: датэрмінова выканаць плян здачы дзяржаве 1600 кг ільнавалакна, 1600 кг пянькі, 1000 кг насеньня, 180 кг насеньня канапель.

Распачата пераапрацоўка лёну. К XIV гадавіне Кастрычнікавай рэволюцыі лён будзе здан.

КАВАЛЁК.

Сталінская-комсамольская пушчана

Магілеў. (Па тэлеграфу ад нашага спэцкора). Магілеўскі чыгуначны вузел уключыўся ў правядзеньне сталінскай эстафэты. Да кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б комсамольцы выпускаюць паравоз з абточкі, організуюць рапарты цэхаў. 11 лепшых ударнікаў перадаюцца ў партыю.

Чуліцкі, Шалькевіч.

Да кастрычнікавых сьвят будзе паравоз

Гомель, 12. (Ад нашага спэцкора). Комсамольскі колектыў чыгункі ўзяўся да 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі адрамантаваць у нерабочы час адзін паравоз звыш пляну.

Не дамо пуставаць сілосным ямам

У Бычанскім колгасе „Спартак“ (Кармянскі раён) сілосная яма яшчэ не запоўнена масай. Колгасная комсамольская ячэйка прапанавала старшыні колгасу свае сілы на што ён адказаў:—„Цяпер у нас праходзіць асеньняя пасеўная кампанія. Весь закончым яе, тады прымемся за сілос“.

Опортуністычныя адносіны старшыні колгасу да сілосаваньня дэзорганізуюць масу колгасьнікаў у мобілізацыі ўсіх сіл на стварэньне моцнай кармовай базы, трэба даць яму адпор. Сілосныя ямы павінны быць запоўнены кормам.

А. Галіна.


Плян сілосаваньня павінен быць выкананы

Колгас „Чырвоная зорка“ (Любаньскі раён) мае жывёлагадоўчы напрамак. Кармамі ён не забясьпечан.

Плян сілосаваньня выконваецца марудным тэмпамі. З патрэбных 115 тон, засілосавана толькі 65 т. Кармы скарыстоўваюцца нерацыянальна. Склады не замкнуты і колгасьнікі бяруць кармы на індывідуальны ўжытак.

Трэба зараз-жа скарыстаць усе магчымасьці і сілы на стопроцантнае выкананьне пляну сілосаваньня.

Вяроўка, Бурда.



Штурмаваць адставаньне бульбяных палёў

УБОРЦЫ і АДГРУЗЦЫ — УДАРНЫЯ ТЭМПЫ

Узьняць тэмпы ўборачнай

Тэмпы ўборкі бульбы у Полацкім раёне нездавальняючыя. На 1-е кастрычніка выкапана 12 проц. засеянай бульбы. Прычыны—дрэннае скарыстаньне і расстаноўка рабочае сілы, слабое, а месцамі фармальнае увядзеньне зьдзельшчыны.

У колгасе „Чырвоны колас“ яшчэ ня ўведзена зьдзельшчына, не наладжан ўлік працы колгасьнікаў. У комуне „Чырвоная зорка“ Экіманьскага сельсавету з 36 га ўбрана толькі 6.

У колгасах Гомельскага сельсавету „Акцябр“ і „Іскра“ з 100 га бульбы ўбрана толькі 13.

У многіх колгасах існуе яшчэ опортуністычная надзея на самацёк.

Факты мінулага году, калі шмат у якіх колгасах амаль палова бульбы засталася на полі зімаваць, павінны быць папярэджаны.

Б.

Жыткавіцкія опортуністыя зрываюць адгрузку бульбы

Менск „Чырвонай Зьмене“

Жыткавічы. 13. Жыткавіцкай комсамольскай організацыяй нарыхтавана 11 вагонаў бульбы. 11 кастрычніка адгружана толькі частка нарыхтаванай бульбы.

Недагрузка тлумачыцца опортуністычнай дзейнасьцю нарыхтоўчых організацый, якія не далі сваячасова заказу на вагоны.

Сэкратар райкамолу Брагінскі.

Лепельская комсамолія рапартуе

11 кастрычніка лепельская комсамолія адгрузіла 8 вагонаў бульбы ў лік 10 эшалёнаў.

К. Ягор.

Не дапусьціць зрыву ўборкі бульбы

Уборка бульбы ў колгасе „Новы селянін“ Стара-Даросскага раёну пачалася 23 верасьня. На 8-X-31 году выбрана толькі 11 га.

Такім чынам, палова бульбы яшчэ ня выбрана, а выбраная ляжыць на полі ў кучах бяз усякага нагляду.

Колгасьнікі выбіраюць сваю бульбу якую праўленьне колгасу адвяло ім на агульных пасевах, а колгасная бульба застаецца на полі.

Колгасьнік.

Папраўкі

У № 239 на другой старонцы, у артыкуле пад назвай „Выкаваць запазычанасьць перад комсамолам“, украліся памылкі. Надрукавана: Пленум ЦК ЛКСМБ, выносячы сваю пастанову аб адставаньні мастацкай пролетарскай літаратуры ад соцыялістычнай практыкі, меў рацыю“. Трэба чытаць: „Пленум ЦК ЛКСМБ адзначыў ў сваёй пастанове адставаньне мастацкай пролетарскай літаратуры ад соцыялістычнай практыкі на што меў рацыю“.

У гэтым-жа артыкуле, у прадапошнім абзацы надрукавана: „Выкінуўшы нацыянал-дэмакратаў з іх апошняй цытадэлі музыкі мы дамо магчымасьць парасткам пролетарскай музыкі р зрастацца ў вышыню і глыбіню“. Трэба чытаць „Выкінуўшы нацыянал-дэмакратаў з музыкі, мы дамо магчымасьці парасткам пролетарскай музыкі яшчэ больш шырока разгарнуць барацьбу за пролетарскую музыку“.

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСАЎ

16 кастрычніка роўна а 7 гадзіне ўвечары, у доме Навукі і Тэхнікі (Комсамольская, 25) склікаецца.

сход актыву Менскай організацыі ЛКСМБ

Парадак дня:

1. Аб стане росту і зьмацаваньня навічкоў.

Яўка актывістых абавязкова.

Білеты ў Менгаркоме.

Нам. сэкратара Менгаркому ЛКСМБ Канопік

ДА ВЕДАМА ўсіх дэлегатаў усебеларускай коопэрацыйнай нарады моладзі

Даводзіцца да ведама ўсіх дэлегатаў усебеларускай коопэрацыйнай нарады аб тым, што **15 кастрычніка**, а 6 гадзіне, у залі пасяджэньняў ЦСПСБ

адбудзецца нарада моладзі

Рэгістрацыя дэлегатаў пачынаецца 15-га, а 10 гадзіне раніцы ў ЦК ЛКСМБ. Праезд у Менск і назад за кошт камандзіруючых коопэрацыйных організацый

ЦК ЛКСМБ

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599.